ЖЫЦЦЁ І ГУКІ

Я застануся гукам
гэтых
Жыццём напісаных радкоў,
Пакуль святая праўда слоў,
Як сонца, ўсходзіць над Сусветам.

Цямнеюць з часам самацветы —
Так сведчыць практыка вякоў,
Я ж застануся гукам
гэтых
Жыццём напісаных радкоў...

Я не збіраюся хаваць
Блоковую закваску:
Маё дзяцінства на ўсю Гаць
Дагэтуль пугай ляскае.
Ды забываю пакрысе
Імклівых коней нораў,
Бо іх другі даўно пасе,
А ў думках бачыць горад.
А я аб вёсцы мару.
Хоць
Таго, што ёсць, не кіну.
Ды як замуляе аброць,
Ўсплываюць успаміны...

# НАША МОВА

Калі браць шчасце за аснову
Трывог спрадвечных і здабыткаў,
Удзячны маці я за мову,
Што сам народ на кроснах выткаў.

Яна ў душы Узой пляскоча
І промнем сонца цёплым служыць,
А ў цішыні зімовай ночы
Сняжынкай лёгка ў небе кружыць.

Яна і ў красках першых весніх,
Яна ў лісцёвым шматгалоссі,
У салаўіных звонкіх песнях
І ў ціхім шоргаце калоссяў.

І на таку яна ў засекі
Цячэ адборным цёплым збожжам.
А мы — з дзяцінства недарэкі —
Любіць яе як след не можам...

Шапталі вусны нема:
«Дзе мы?

Кажу табе сур’ёзна —
Позна...»

А я ўсё блытаў косы..
«Досыць...»

І цалаваў паспешна...
«Грэшнік...»

Чуў, як трымцела цела...
«Смелы...»

Як ты губляла сілы...
«Мілы...»

Са мной зямля і неба:
«Трэба...»

І вось у зрэнках згода:
«Родны...»

## ВЯСЁЛАЕ ПОЛЕ

*Вясёлае поле – вёска ва Урыцкім сельсавеце*
*Гомельскага раёна. Спалена фашыстамі*
*ў 1943 годзе і не адноўлена.*

Вясёламу Полю — не весела,
Вясёламу Полю — не песенна,
І ранняй вясной, як адснежыцца,
Дзіцяны тут смех не прарэжацца.

Не зойдуцца клёкатам зранку
Буслы над сваёю буслянкай,
Каханне да весніц не туліцца:
Ні весніц,
ні хат
і ні вуліцы.
Адзін абеліск непрыкметны
Ўглядаецца ў жыта улетку:
Мо з’явіцца хто,
абзавецца,
Глядзіш, весялей зажывецца.

А ўзімку ні мары, ні жыта,
Марозам і снегам спавітае Вясёлае Поле,
Вясёлае Поле...
Ды сумная доля.

Дзе сонца шмат, ды больш вады,
Дзе лешч аж скача ў чоўны:
Такое месца — Даўляды,
На поўдзень ад Нароўлі.
Ды што тлумачыць-гаварыць,
Таму ёсць сведка — Прыпяць,
Якую ўраз не пераплыць,
Як соку жбан не выпіць.
Дарогу ведалі сюды
Мазыр і Гомель людны,
Іх сустракалі Даўляды,
Давалі чоўны, вуды,
А бакеншчык — Няптун сівы —
Скрозь раіў вір пры стрэчы:
«Там сом бярэ, як паплавы
Ў туман загорне вечар...»
І, кажуць, шэнціла заўжды
Таму, хто цвёрды духам!
... Дзе вы сягоння, Даўляды,
Пасля той майскай скрухі?

* * *

…І будзе лета апасля
З дажджамі і вясёлкай,
Наўкол расквеціцца зямля
Рамонкамі і смолкай.
Над імі будзе віцца чмель,
Бязважкія стракозы,
І асцярожны журавель
Нырне у вербалозы.
І сонца ўстане спакваля,
Як і раней, паверце!
... І будзе лета апасля
Маёй і вашай смерці...

Калі з таполі тоўстай, што над хатай
Галіны распластала, як шацёр,
Сарвецца іней хмараю бухматай
І шугане лавінаю ў наш двор —

Прыціхнуць ўсе:
Палкан у будцы цеснай,
Гарласты певень, хітры рыжы кот.
Адразу снегу хопіць ім і месца,
Што дзеляць не падзеляць столькі год...

І сам не пазнаю сябе сягоння:
Хоць холаду з дзяцінства не люблю,
Ды падстаўляю інею далоні
І быццам іскры срэбныя лаўлю!..

ПАМЯЦІ МАЦІ

А ты ўсё хвалявалася:
«Нягода,
Хаця б не змерзлі ў завязі гуркі...»
І кожная раслінка ў агародзе
Адчула цеплыню тваёй рукі.

Казала ты: «Не выжыве капуста...»
Нібы сабе зноў робячы папрок,
І загарэлы твар прыкрыўшы хусткай,
Ішла палоць цыбулю і укроп.

Даруй, ты памылілася, матуля.
Як многа шчэ няшчасця на зямлі...
На гэты раз капуста і цыбуля
Цябе, нібы знарок, перажылі...

Гуркі ўжо адцвілі, і памідоры
Убраліся у сілу на градзе —
Усё расце, цвіце...
Вось толькі гора —
Цябе няма...
Няма цябе нідзе...

* * *

Дарога санная віхляе між сумётаў,
І з ноздраў конскіх шчодра пара пыхкае,
А сэрца чуйнае ў раскутасці палёту
Застыла вераб’ём і больш не пырхае...

Яшчэ праехацца б у гэткую ахвоту,
Каб белы свет капыціў снежнай замяццю,
Каб за далёкім і нябачным паваротам
Сустрэцца са святлом шчымлівай памяці...